Palitsfera Working Papers No. 1/2026 (v.2)

# БЕЛАРУСКІЯ СТУДЭНТЫ Ў ЕЎРОПЕ

## КОЛЬКАСЦЬ КРАІНЫ ДЫНАМІКА



Palitsfera Working Papers No. 1/2026 (v.2)

# БЕЛАРУСКІЯ СТУДЭНТЫ Ў ЕЎРОПЕ

## КОЛЬКАСЦЬ. КРАІНЫ. ДЫНАМІКА

**Беларускія студэнты за мяжой:**
**рост долі і змена выбару паміж Расіяй і ЕС.**
Аналіз дынамікі ў 37 краінах — галоўныя тэндэнцыі дзесяцігоддзя

Андрэй Казакевіч, PhD у галіне палітычных навук;
Кацярына Ганчарэнка і іншыя

Інстытут палітычных даследаванняў
«Палітычная сфера»

2026

# Рэзюмэ

*Даследаванне прапануе падрабязны аналіз адукацыйнай міграцыі з Беларусі ў 35 краін Еўропы, Турцыю і Расію ў 2013-2025 гадах. За гэты перыяд колькасць беларускіх студэнтаў за мяжой у абсалютных лічбах знізілася (з каля 34 тыс. У 2013-м да 28,8 тыс. у 2023-м), але ў суадносінах з колькасцю студэнтаў унутры Беларусі іх доля прыкметна вырасла. Цяпер на аднаго студэнта замежжа прыпадае прыкладна сем студэнтаў у Беларусі, дзесяць гадоў таму суадносіны складалі адзін да трынаццаці.*

*Кардынальна змяніліся кірункі міграцыі. Доля Расіі ўпала з 70% да 32% ад агульнай колькасці, а ў лідары вырвалася Польшча — з 11% да 44%. Значна выраслі долі іншых краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы — пры стагнацыі і скарачэнні ў Заходняй і Паўночнай Еўропе.*

*Даследаванне фіксуе важныя тэндэнцыі размеркавання беларускіх студэнтаў за мяжой і іх прычыны, што можа быць выкарыстана пры распрацоўванні адукацыйных і акадэмічных праграм. У канцы даследавання — асноўныя высновы і прагнозы.*

***Ключавыя словы:*** *Беларусь, студэнты, міграцыя з Беларусі, адукацыя ЕС, адукацыя Расіі*

Вышэйшая адукацыя Беларусі істотна змянілася за апошнія 10-15 гадоў. Змены былі абумоўлены як унутранымі крызісамі, так і маштабнай рэгіянальнай нестабільнасцю. Пасля падзей 2020 года навучальныя праграмы і студэнцкае жыццё ўнутры краіны сутыкнуліся з выразнай ідэалагізацыяй і ўзмацненнем кантролю з боку дзяржавы. Гэта сур'ёзна ўплывае на развіццё вышэйшай адукацыі.

Дадатковым важным фактарам змен стала ізаляцыя Беларусі, якая істотна паглыбілася пасля пачатку поўнамаштабнай вайны Расіі супраць Украіны. Ізаляцыя прывяла да рэзкага скарачэння міжнароднага акадэмічнага супрацоўніцтва, а таксама абмену ведамі і акадэмічным досведам з краінамі Захаду.

Пры гэтым беларусы працягваюць актыўна атрымліваць адукацыю за мяжой. Гэтае даследаванне накіравана на дэталёвы аналіз адукацыйнай міграцыі з Беларусі ў Еўропу і Расію на працягу апошняга дзесяцігоддзя — ад 2013-га па 2025 год — з мэтай выявіць інтэнсіўнасць і кірункі гэтага працэсу.

Актуальнасць даследавання абумоўлена тым, што міграцыя беларускіх студэнтаў звычайна разглядаецца на падставе фрагментарных або недакладных дадзеных. У выніку як у беларускім асяроддзі, так і на еўра-пейскім узроўні фарміруецца спрошчанае, а часам і памылковае разуменне сітуацыі, якое не ўлічвае маштабу і кірункаў міграцыйных працэсаў.

Аналіз адукацыйнай мабільнасці неабходны для распрацоўвання і рэалізацыі еўрапейскіх праграм і ініцыятыў рознага тыпу. Такім чынам, даследаванне з'яўляецца важным як для еўрапейскіх і нацыянальных структур, уцягнутых у працу з беларускімі студэнтамі, так і для беларускай супольнасці, для якой важна перавесці дыскусіі па абазначанай тэме ў плоскасць заснаванага на фактах аналізу.

# Метады і крыніцы даследавання

У межах даследавання збіралася інфармацыя пра колькасць беларускіх студэнтаў у еўрапейскіх краінах і Расіі з 2013-га па 2025 год.[1] Акрамя гэтага, у выбарку была ўключана Турцыя, якая шчыльна звязаная з еўрапейскай адукацыйнай прастораю. Пры складанні выбаркі мы зыходзім з таго, што менавіта ў еўрапейскім рэгіёне сканцэнтравана асноўная маса беларускіх студэнтаў замежжа (паводле нашых ацэнак — звыш 95%). Па-за межамі Еўропы можна вылучыць дзве важныя краіны: ЗША (300-400) і Кітай (1-1,5 тыс.), таксама пэўная колькасць студэнтаў распылена па ўсім свеце. У будучыні мы маем намер пашырыць геаграфію даследавання, але ў межах гэтай справаздачы пад беларускімі студэнтамі замежжа мы маем на ўвазе толькі студэнтаў еўрапейскага рэгіёну.

1. Нацыянальныя і еўрапейскія статыстычныя ўстановы могуць па–рознаму пазначаць дадзеныя пра колькасць студэнтаў у асобны навучальны год. У адных выпадках пазначаецца навучальны год (2015/2016), у іншых каляндарны год пачатку навучання (2015). У гэтым выданні мы будзем выкарыстоўваць другі падыход, гэта значыць 2015 замест 2015/2016, 2017 замест 2017/2018.

2013 год быў выбраны за адпраўны пункт, бо даследаванне з'яўляецца працягам і развіццём маніторынгу “Палітычнай сферы” 2023 года.[2]

Статыстыка збіралася з дзвюх асноўных крыніц. Па-першае, імі былі інфармацыйныя рэсурсы нацыянальных статыстычных агенцтваў замежных краін, а таксама міжнародных арганізацый, асабліва Еўрастата (Eurostat) і Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (OECD) . Па-другое, крыніцай былі прамыя звароты ў нацыянальныя статыстычныя агенцтвы і іншыя дзяржаўныя органы краін Еўропы, калі патрэбная інфармацыя ў адкрытым доступе адсутнічала.

У межах даследавання мы імкнуліся працаваць з першакрыніцамі статыстычнай інфармацыі: нацыянальнымі міністэрствамі і Erostat. Нягледзячы на наяўнасць некалькіх аб'яднаных баз па тэме (у прыватнасці, базе UNESCO па студэнцкай мабільнасці), яны не заўсёды аказваліся прыдатнымі для аналізу. Перш за ўсё праз непаўнату дадзеных, а таксама вялікія часавыя затрымкі размяшчэння звестак з асобных краін.

Дадзеныя збіраліся з 37 краін.[3] З 2013-га па 2023 год інфармацыю атрымалася сабраць практычна аб усіх краінах. За 2024 год яна даступная аб 18, у тым ліку ўсіх важных, за выключэннем Германіі. На жаль, за 2025 год статыстыка фрагментарная і даступная ўсяго для некалькіх краін.[4] Выпадзенні дадзеных улічаныя пры аналізе і фармуляванні асноўных высноў.

У даследаванні ўлічваліся студэнты, якія навучаліся і навучаюцца на бакалаўрскіх і магістарскіх праграмах усіх формаў навучання. Для Расіі таксама ўлічаны праграмы спецыялітэту.

Пасля збору дадзеных быў праведзены статыстычны і параўнальны аналіз. Найбольшая ўвага была ўдзелена краінам са значнай прысутнасцю беларускіх студэнтаў. Парог значнасці ў межах гэтага даследавання — больш за 1 тыс. студэнтаў у любы год паміж 2013-м і 2025-м. Такіх краін пяць: Польшча, Расія, Германія, Літва і Чэхія. Фокусам аналізу была дынаміка агульнай колькасці студэнтаў, а не вывучэнне дэмаграфічных, эканамічных і палітычных фактараў, якія ўплывалі на адукацыйную міграцыю.

---

2. Пракопчык, Лізавета (2023). Беларускія студэнты ў Еўропе Колькасць. Краіны. Дынаміка. Палітычная сфера. https://palityka.org/wp-content/uploads/2024/04/Bel-Students-in-Europe.docx.pdf

3. 27 краін ЕС, а таксама Украіна, Сербія, Расія, Нарвегія, Швейцарыя, Ісландыя, Турцыя, Албанія, Вялікабрытанія, Чарнагорыя.

4. За 2025 год статыстыка даступная толькі па Літве, Нарвегіі і Расіі. Інфармацыя за 2013 навучальны год адсутнічае па Венгрыі, Вялікабрытаніі і Латвіі. За 2013 — 2014 гады адсутнічае інфармацыі па Сербіі і Турцыі. За 2013—2015 па Мальце. За ўвесь перыяд не зафіксавана беларускіх студэнтаў у Чарнагорыі і Албаніі. Пазначаныя выпадзенні не павінны істотна паўплываць на аналіз асноўных тэндэнцый адукацыйнай міграцыі з Беларусі.

# Грамадская думка ў Беларусі наконт адукацыі за мяжой

Асобныя даследаванні, праведзеныя ў апошнія гады, змяшчаюць важныя назіранні за ўстаноўкамі беларускай моладзі, а таксама яе прыярытэтамі ў выбары адукацыі.

У адным з апытанняў амаль палова ўдзельнікаў, 45%, адзначыла, што жадала б пераехаць у іншую краіну. Пры гэтым 19% не проста разглядаюць такую магчымасць, але ўжо актыўна плануюць, а 15% ужо пачалі захады для пераезду.[5]

У даследаванні, праведзеным Інстытутам «Палітычная сфера» ў жніўні 2023 года, бацькам задавалі пытанне пра пажаданыя краіны для адукацыі дзяцей (дазваляўся множны выбар). Беларускія ўніверсітэты застаюцца выбарам для 52% рэспандэнтаў.

Тым не менш многія хацелі б накіраваць дзяцей на навучанне за мяжой. Тут найбольш папулярным кірункам была Расія (41%), прыкладна столькі ж выбралі Заходнюю Еўропу і ЗША (38%), 22% Польшчу і 6% Літву.[6]

Абодва даследаванні адлюстроўваюць значную зацікаўленасць беларускай моладзі і бацькоў у адукацыйных магчымасцях за межамі краіны. Высокі ўзровень актыўнасці ў планаванні пераезду і выбар адукацыйных кірункаў сведчаць пра значныя выклікі для беларускага грамадства.

---

5. Апытанне праходзіла анлайн з 4 красавіка па 15 траўня 2023 года, удзел узяў 841 чалавек ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў. Больш падрабязна: Грамадска-палітычныя погляды беларускай моладзі. Аналітычная справаздача 31 траўня 2023. с. 30 https://drive.google.com/file/d/1FhgAufgCi2KUvHc_qC0R5IHJvdM7GwwX/view

6. Пытанне гучала наступным чынам: «Калі б вам прыйшлося выбіраць, якія краіны былі б для вас прыярытэтам для адпраўкі вашых дзяцей ва ўніверсітэт?». Метадалогія даследавання: анлайн-апытанне, жыхары паселішчаў з насельніцтвам больш за 5 тыс., 1002 рэспандэнты. Час правядзення: жнівень 2023 года. Больш падрабязна глядзі: Ластовский, Алексей (2023). Система образования: общественные ожидания и оценки. Палітычная сфера. с. 19. https://palityka.org/wp-content/uploads/2024/03/%D0%A1%D0%98%D0%A1%D0%A2%D0%95%D0%9C%D0%90-%D0%9E%D0%91%D0%A0%D0%90%D0%97%D0%9E%D0%92%D0%90%D0%9D%D0%98%D0%AF.pdf

# Колькасць беларускіх студэнтаў за мяжой

Унутры Беларусі колькасць студэнтаў з кожным годам змяншаецца, галоўным чынам з прычыны неспрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыі ў 1990-х і 2000-х гадах. З 2013-га па 2023 год колькасць студэнтаў скарацілася на 46%.[7]

Колькасць беларускіх студэнтаў за мяжой у абсалютных лічбах таксама скарацілася. У 2013 годзе ў Еўропе і Расіі іх навучалася каля 34 тыс., пасля гэтага адбывалася дастаткова хуткае падзенне колькасці, мінімум якой прыпадае на 2017 год — крыху больш за 22 тыс. Пасля адбыўся аднаўленчы рост, і за апошні год, пра які даступны поўны масіў дадзеных (2023), колькасць беларускіх студэнтаў за мяжой дасягнула амаль 29 тыс.

Аднак зусім па-іншаму сітуацыя з беларускімі студэнтамі за мяжой выглядае пры параўнанні з сітуацыяй унутры краіны. Суадносіны паміж унутранымі і замежнымі студэнтамі кардынальным чынам змянілася. Найбольшая вага першых за апошняе дзесяцігоддзе назіралася ў 2016 годзе, калі на аднаго студэнта замежжа прыпадалі 13 студэнтаў у Беларусі, але ўжо ў 2023 годзе на аднаго беларускага студэнта ў замежным універсітэце прыпадалі толькі 7 студэнтаў у ВНУ Беларусі.

За апошняе дзесяцігоддзе значна ўпала колькасць беларускіх навучэнцаў у Расіі, з амаль 24 тыс. (2013) да 10,6 тыс. (2025). Захады для прыцягнення новых студэнтаў з Беларусі, якія рабіў расійскі ўрад пасля 2020 года, значна не змянілі сітуацыю (больш падрабязна гл. ніжэй).

Пры гэтым колькасць беларускіх студэнтаў у ЕС і іншых еўрапейскіх краінах дэманструе адваротную тэндэнцыю. З 2013-га па 2023 год іх колькасць павялічылася ў больш як у два разы — з 9,7 тыс. да 19,5 тыс. чалавек. Паводле папярэдніх дадзеных, пасля 2023 года гэтая колькасць засталася без значных змен і знаходзіцца ў дыяпазоне 19–20 тыс.

7. З 380 тыс. да 204 тыс. студэнтаў, не ўлічваючы іншаземцаў. Разлічана па зборніках Нацыянальнага статыстычнага камітэту Рэспублікі Беларусь “Образование в Республике Беларусь” за 2013–2024 гады https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/solialnaya-sfera/obrazovanie/publikatsii_8/




Малюнак 1. Колькасць беларускіх студэнтаў за мяжой, 37 краін, 2013–2023

Паміж 2013-м і 2017 годам сярэдні гадавы прырост колькасці студэнтаў у еўрапейскіх універсітэтах складаў больш за 400 чалавек. З 2018-га па 2022-і, асабліва пасля пачатку палітычнага крызісу 2020 года і вайны Расіі супраць Украіны, колькасць беларускіх студэнтаў за мяжой расла ў сярэднім на 1,48 тыс. за год. Рост спыніўся толькі ў 2023 годзе, калі прырост склаў толькі 334 студэнты.




Малюнак 2. Колькасць беларускіх студэнтаў за мяжой, 36 краін, 2013–2023

# Размеркаванне беларускіх студэнтаў па замежных краінах

**Дзве ключавыя краіны.** Большасць беларускіх студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю за мяжой, канцэнтруюцца ў Польшчы і Расіі. Сярэдняя доля гэтых краін ад агульнай колькасці беларускіх студэнтаў замежжа з 2013–га па 2024 год складала 76,6%. Дзесяцігоддзе таму ў Польшчы і Расіі навучаліся 82% беларускіх студэнтаў замежжа. Праз падзенне колькасці студэнтаў у Расіі перад 2017 годам доля знізілася да 74%, але пазней зноў вырасла да 76%.

**Тры значныя краіны.** Сярод іншых дзяржаў, якія вабяць беларускіх студэнтаў, яшчэ тры можна аднесці да катэгорыі значных: Германію, Чэхію і Літву. У кожнай з гэтых краін у апошнія тры гады вучылася 1–1,6 тыс. студэнтаў. Дзве ключавыя (Польшча і Расія) і тры значныя краіны (Германія, Чэхія і Літва) аказваюць адукацыйныя паслугі для больш як 90% студэнтаў замежжа.[8]




Малюнак 3. Колькасці беларускіх студэнтаў Польшчы і Расіі, 2013–2024

**Прыкметныя і іншыя краіны.** Да менш папулярных, але прыкметных

8. Сярэдняя доля гэтых краін за 2013–2024 гады складала 91%.

можна аднесці чатыры краіны, дзе вучыцца больш за 200 студэнтаў: Італія, Славакія, Францыя, Украіна.[9] Ад 100 да 200 студэнтаў навучаюцца ў пяці краінах — Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Нідэрландах, Фінляндыі і Нарвегіі (гл. табліцу 1). У іншых краінах навучаюцца дзясяткі беларусаў, а ў асобных выпадках (Ісландыя, Ірландыя, Люксембург, Харватыя і Румынія) адзінкі.

© Палітычная сфера




Малюнак 4. Размеркаванне беларускіх студэнтаў па краінах, %, 2022-2023

9. Каб знізіць уплыў выпадковых ваганняў колькасці, тут мы выкарыстоўваем сярэднюю колькасць студэнтаў у 2021—2023 гадах, гэта значыць пасля пачатку палітычнага крызісу ў Беларусі, і да апошняга года, пра які даступная статыстыка па ўсіх краінах. Сярэдняя колькасць студэнтаў у Францыі складала крыху менш за 200 (199,33), але мы палічылі магчымым аднесці яе да ліку прыкметных краін. Колькасць беларускіх студэнтаў ва Украіне дасягнула максімуму ў 2020 годзе (454), пасля пачатку вайны іх колькасць імкліва скарацілася — да 112 на 2024 год.

© Палітычная сфера

| Краіна | Колькасць, тыс./доля студэнтаў |
|---|---|
| **Ключавыя краіны** | |
| Польшча | 12,15 (44,05%) |
| Расія | 8,98 (32,57%) |
| **Значныя краіны** | |
| Нямеччына | 1,62 (5,88%) |
| Літва | 1,37 (4,97%) |
| Чэхія | 1,03 (3.5%) |
| **Краіны з прыкметнай колькасцю** | |
| Італія | 0,4 (1,45%) |
| Украіна | 0,26 (0,96%) |
| Славакія | 0,23 (0,83%) |
| Францыя | 0,2 (0,72%) |
| Аўстрыя | 0,17 (0,62%) |
| Вялікабрытанія | 0,13 (0,47%) |
| Нідэрланды | 0,11 (0,40%) |
| Нарвегія | 0,11 (0,41%) |
| Фінляндыя | 0,11 (0,41%) |
| **Усяго** | **27,58 тыс. (100%)** |

Табліца 1. Агульная і адносная колькасць беларускіх студэнтаў па краінах, сярэднія значэнні за 2021–2023 гады[10]

10. Лічбы акругленыя да дзясяткаў. Прыведзены сярэдняя колькасць і сярэдняя доля ў 2021—2023 гадах.

# Зоны росту і скарачэння беларускіх студэнтаў

**Зоны росту.** Аналіз дынамікі па асобных краінах без уліку тых, дзе сярэдняя колькасць студэнтаў не перавышала 10 чалавек, дазваляе зафіксаваць асноўныя зоны росту беларускай прысутнасці. Галоўным чынам гэта новыя члены ЕС з Усходняй Еўропы.[11] Калі абапірацца на сярэдні прырост беларускіх студэнтаў за ўвесь перыяд даследавання, то стабільны рост назіраўся ў 14 краінах. Калі браць пад увагу толькі апошнія пяць гадоў, то такіх краін будзе 19.[12]

Абсалютным лідарам у тэмпах росту была Славакія — з 18 чалавек у 2013 годзе колькасць беларускіх студэнтаў тут вырасла да 426 у 2024-м. Сярэдні рост за перыяд даследавання, такім чынам, склаў больш за 30% на год. Таксама вельмі высокія тэмпы росту прадэманстравалі Сербія (30,5%), Турцыя (23%) і Мальта (27,5%). Для гэтых краін, на жаль, дадзеныя не поўныя, што не дазваляе надзейна фіксаваць тэндэнцыі. Колькасць студэнтаў у Мальце застаецца невялікай (21 чалавек), імклівы рост у Сербіі з 6 (2021) да 64 (2022), відавочна, быў звязаны з пачаткам вайны ва Украіне, у пазнейшыя гады адбылося хуткае скарачэнне. Толькі Турцыю можна разглядаць у якасці прыкметнага новага кірунку — 103 студэнты на 2023 год.

Высокія тэмпы росту таксама прадэманстравалі такія краіны Усходняй Еўропы, як Эстонія (13%), Польшча (11,8%), Славенія (11,5%), а таксама Чэхія (6%). Са «старой» Еўропы прыкметнымі паказчыкамі адзначыліся толькі Фінляндыя (7,2%), Нідэрланды (9,1%) і Партугалія (5,6%). Невялікі рост беларускага студэнцтва меў месца ў Грэцыі (2,7%), Аўстрыі (1,8%), Іспаніі (1,5%).

11. Пад Усходняй Еўропай у дадзеным выпадку мы маем на ўвазе ўсе посткамуністычныя і еўрапейскія постсавецкія краіны.

12. Для параўнання ўлічваюцца толькі гады па якім даступна поўная статыстыка. Поўны перыяд даследавання: 2013–2023 гады, апошнія пяць год: 2019–2023 гады.

© Палітычная сфера




Малюнак 5. Сярэдні гадавы рост і скарачэнне колькасці беларускіх студэнтаў па краінах, 2013–2023 гады.

**Зоны стагнацыі.** Для трох краін можна фіксаваць рост ці падзенне за перыяд даследавання ў дыяпазоне плюс-мінус 1%, што мы інтэрпрэтуем як стагнацыю. Сюды трапляюць тры краіны — Бельгія (0%), Літва (−0,38%) і Балгарыя (−0,42%).

З гэтых краін важным выпадкам з’яўляецца Літва, яго мы падрабязна разгледзім ніжэй.




Малюнак 6. Славакія — лідар у тэмпах росту колькасці студэнтаў з Беларусі ў 2013–2024 гадах

**Зоны скарачэння.** У іншых краінах назіралася падзенне колькасці беларускіх студэнтаў паміж 2013-м і 2023 годам. Найбольшыя тэмпы падзення былі ў трох постсавецкіх краінах: Латвіі (−9,5%), Украіне (−9,5%) і Расіі (−8,3%). Пасля ідуць краіны Заходняй і Паўночнай Еўропы: Швецыя (−7,3%), Данія (−6,1%), Вялікабрытанія (−6%), Нарвегія (−5,6%), Францыя (−5,1%).

Зону адносна невялікага скарачэння складаюць Венгрыя (−3,8%), Кіпр (−3,3%), Швейцарыя (−2%), а таксама такія важныя краіны з пункту гледжання агульнай колькасці, як Германія (−1,3%) і Італія (−1,5%).

**Тэндэнцыі апошніх гадоў.** Калі аналізаваць толькі апошнія пяць гадоў даступнай для ўсіх краін статыстыкі (2019–2023), то варта адзначыць пашырэнне зоны росту беларускіх і паскарэнне тэмпаў росту ў большасці краін. На фоне падзення за ўвесь перыяд у апошнія гады назіраўся рост у Італіі (+16%), Кіпры (+35%), Швейцарыі (+1,2%). На фоне стагнацыі за ўвесь перыяд рост у апошнія гады прадэманстравала Літва (+15%) і Балгарыя (+10%) Прыкметна павялічыліся тэмпы росту ў Іспаніі (+9,7%), Славакіі (+52,6%), пры гэтым тэмпы росту ў Эстоніі, наадварот, замарудзіліся (+1,8%). Прадказальна паскорыліся тэмпы падзення ва Украіне (−15%), а вось у Расіі яны значна скараціліся (−1,6%).

# Беларускія студэнты ў асобных краінах

## Беларускія студэнты ў Польшчы

Польшча з’яўляецца асноўным кірункам міграцыі беларускіх студэнтаў. У гэтай краіне беларусы складаюць каля 12% усіх замежных студэнтаў, што робіць іх другой пасля ўкраінцаў групаю (43,8%).[13]




Малюнак 7. Колькасць студэнтаў з Беларусі ў Польшчы, 2013–2024

З 2013 года колькасць беларускіх студэнтаў у Польшчы за наступнае дзесяцігоддзе вырасла больш як утрая: з 3,7 тыс. да 12,7 тыс. у 2023 годзе. Гэты рост быў даволі выразным яшчэ да падзей 2020-га. Ён дэманструе стабільную цікавасць да атрымання адукацыі ў гэтай краіне, асабліва пасля 2018-га, калі іншаземцы з валоданнем польскай мовай на ўзроўні С1 атрымалі магчымасць бясплатнага навучання.[14]

13. Szkolnictwo wyższe w roku akademickim 2024/2025. Główny Urząd Statystyczny https://stat.gov.pl/obszary-tematyczne/edukacja/edukacja/szkolnictwo-wyzsze-w-roku-akademickim-20242025,8,11.html

14. Na jakich zasadach cudzoziemcy podejmują i odbywają naukę w polskich szkołach wyższych.". Ministerstwo Edukacji i Nauki. https://www.gov.pl/web/nauka/na-jakich-zasadach-cudzoziemcy-podejmuja-i-odbywaja-nauki-w-polskich-szkolach-wyzszych.

З 2014-га па 2022 год сярэдні прырост студэнтаў складаў каля 1 тыс. на год. Пікавыя значэнні прыпадаюць на 2020–2022 гады (прырост 1,3–1,6 тыс.), што было вынікам палітычнага крызісу 2020-га і пачаткам вайны Расіі супраць Украіны. Па выніках 2023 года рост запаволіўся і склаў толькі 22 студэнты, а з 2024 года ўпершыню за перыяд аналізу колькасць беларускіх студэнтаў скарацілася адразу на 500 чалавек.

Зніжэнне можна тлумачыць спадам хвалі палітычнай міграцыі з Беларусі, якая пачалася пасля пратэстаў 2020 года і пачатку вайны ва Украіне, а таксама ўскладненнем правілаў прыёму і бюракратычных працэдур.[15] Асабліва гэта тычыцца новых патрабаванняў да прызнання дакументаў, што закранула не толькі паступленне, але і працяг навучання. Дадатковыя ўскладненні былі звязаныя з атрыманнем студэнцкіх віз, што закранула не толькі беларусаў, але і ўсіх замежных студэнтаў, колькасць якіх пасля 2023 года стала скарачацца.

Невядома, наколькі тэндэнцыя зніжэння ўстойлівая, але існуюць падставы меркаваць, што пік росту пройдзены і колькасць беларускіх студэнтаў у Польшчы стабілізуецца на ўзроўні 11,5–12,5 тыс.

15 Напрыклад, з 1 ліпеня 2025 года ў Польшчы закон абавязвае замежных абітурыентаў пацвярджаць веданне польскай на ўзроўні не ніжэй за B2. Пры гэтым, прызнаюцца толькі дзяржаўныя або міжнародныя сертыфікаты, унутраныя іспыты згубілі сілу з 1 жніўня. Закон быў прыняты падчас уступнай кампаніі, а некаторыя моўныя іспыты адбываліся ў кастрычніку-лістападзе, калі ў многіх універсітэтах уступная кампанія ўжо завяршыліся.

# Беларускія студэнты ў Расіі

Расія працяглы час была лідарам у прыцягненні беларусаў, якія імкнуцца атрымаць вышэйшую адукацыю за мяжой, але сітуацыя істотна змянілася за апошняе дзесяцігоддзе. Калі ў 2013 годзе ў Расіі навучаліся 23,85 тыс. беларусаў, то ў 2025 годзе іх колькасць склала 10,6 тыс. чалавек.




Малюнак 8. Колькасць беларускіх студэнтаў у Расіі, 2013–2025

Мінімум прыпадае на 2021 год – 8,8 тыс. Спрашчэнне правілаў паступлення ў расійскія ВНУ для студэнтаў з Беларусі ўвесну 2021–га[16] крыху змяніла сітуацыю, і з 2023–га назіраецца прыкметны рост. Тым не менш на гэты момант лічбы вельмі далёкія ад дзесяцігадовай даўнасці. Варта адзначыць, што рост колькасці беларускіх студэнтаў у Расіі адбываецца на фоне стабілізацыі лічбаў у краінах ЕС.

Аналіз колькасці беларускіх студэнтаў у Расіі патрабуе двух істотных удакладненняў, якія не заўсёды ўлічваюцца пры аналізе адукацыйнай міграцыі ў Расію.

Па-першае, грамадзяне Беларусі, якія выбіраюць універсітэты Расіі, у сваёй масе навучаюцца ў завочнай і вочна-завочнай форме. Гэта значыць, вучацца

16. Порядок приема на обучение по образовательным программам высшего образования — программам бакалавриата, программам специалитета, программам магистратуры. Министерство науки и высшего образования Российской Федерации, https://www.minobrnauki.gov.ru/upload/iblock/912/912b7b4cabb2d9b433cbf7e1738856d3.pdf.

дыстанцыйна, мала інтэгруюцца ў культурную і сацыяльную прастору сваіх універсітэтаў і арыентаваныя хутчэй на фармальнае платнае атрыманне дыплома. Магчымасць атрымаць дыплом праз навучанне на рускай мове, па спрошчанай праграме і з аслабленымі патрабаваннямі, пэўна, мае ключавое значэнне ў выбары расійскіх ВНУ.

Калі ў еўрапейскіх краінах доля дыстанцыйных формаў навучання невялікая, напрыклад у Польшчы яна складае каля 11%,[17] то ў Расіі на 2025 год доля завочнага навучання складала 24,1%, а вочна-завочнага – 47,6%.

Змястоўная розніца паміж завочнай і вочна-завочнай формамі навучання ў расійскіх універсітэтах невялікая.

Апошняя форма стала набываць папулярнасць сярод беларускіх студэнтаў толькі пасля 2021 года, да гэтага яна складала ў сярэднім каля 4%. Такія змены звязаны больш з асаблівасцямі прававога рэгулявання статусу навучальных праграм, чым зменамі ў змесце і методыках навучання. Значэнне дыстанцыйных формаў навучання для беларускіх студэнтаў змянялася з часам, найбольшым яно была на пачатку перыяду даследавання (73–77%), потым паступова зніжалася амаль да паловы ў 2021 годзе (51,5%), але пазней зноў вырасла да 71,7%. У абсалютных лічбах на 2025 год гэта складала 7,6 тыс. дыстанцыйных студэнтаў супраць 3 тыс. дзённых.

Другі важны момант — значэнне расійскага дзяржаўнага фінансавання ў падтрымцы беларускіх студэнтаў. Нягледзячы на пашыранае ў беларускай супольнасці меркаванне, яно адносна невялікае і ахоплівае зараз толькі 15,1% беларускіх студэнтаў. Раней гэты паказчык быў вышэйшы, але ніколі не перавышаў трацін ад агульнай колькасці. На 96–97% дзяржаўнае фінансаванне складаецца з грошай федэральнага бюджэту і толькі некалькі адсоткаў прыпадае на сродкі суб’ектаў Расійскай Федэрацыі і мясцовых бюджэтаў. Галоўным чынам падтрымку з расійскіх бюджэтаў рознага ўзроўню атрымліваюць студэнты вочнай формы навучання, сярод якіх доля бюджэтнікаў на 2025 год складала 43,7%. У абсалютных лічбах гэта 1,3 тыс. студэнтаў; дадаткова за кошт федэральнага бюджэту завочна і вочна-завочна навучаліся 290 чалавек. Усе іншыя студэнты атрымлівалі адукацыю паводле дагавораў платных паслуг, частка такіх дагавораў аплачваецца з бюджэтных сродкаў Беларусі.

17. RAD-on systema. https://radon.nauka.gov.pl/

# Беларускія студэнты ў Літве

Беларусы маюць статус адной з самых масавых груп сярод іншаземных студэнтаў Літвы. Лідарамі беларусы перасталі быць толькі пасля пачатку шырокамаштабных ваенных дзеянняў Расіі супраць Украіны ў 2022 годзе, калі былі разгорнутыя праграмы дапамогі ўкраінскім студэнтам.

За апошняе дзесяцігоддзе дынаміка колькасці беларускіх студэнтаў у Літве была рознанакіраванаю. Пікавыя значэнні прыпадаюць на пачатак перыяду, калі ў 2013 годзе іх колькасць складала 1,68 тыс. Пасля назіралася ўстойлівае падзенне, якое дасягнула найніжэйшага ўзроўню ў 2019 годзе – 818 чалавек.

Палітычны крызіс у Беларусі 2020 года прывёў да злому тэндэнцыі, і колькасць студэнтаў пачала імкліва расці за кошт пашырэння стыпендыяльных праграм, а таксама новай хвалі ўкладанняў у Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт. Рост працягваўся да 2023 года, калі літоўскія ўніверсітэты наведвалі каля 1,61 тыс. беларускіх студэнтаў. У два наступныя навучальныя гады колькасць знізілася і стабілізавалася на ўзроўні крыху вышэй за 1,5 тыс.

Большасць беларускіх студэнтаў Літвы навучаецца ў ЕГУ, дзе канцэнтруецца звыш 75% іх колькасці, але агульнай тэндэнцыяй пасля палітычнага крызісу ў Беларусі[18] было павелічэнне значэння іншых літоўскіх універсітэтаў за кошт праграм мэтавых стыпендый. Калі да 2020 года ў сярэднім у звычайных (не ЕГУ) універсітэтах Літвы навучалася каля дзвюх сотняў беларусаў, то ў 2020-м гэтая лічба павялічылася да 363, а ў 2022-м — да 411[19]. Пазней колькасць стала скарачацца і на 2025 год склала 324 чалавекі.

18. Сярэдняя доля ЕГУ у 2013-2025 гадах – 76,6%. На 2025 год – 78,6%.

19. Казакевич, Андрей; Величкайте, Вика (2023). Собирая факты: миграция из Беларуси в Литву до и после кризиса 2020 года PS #1/2023, «Палітычная сфера». https://palityka.org/wp-content/uploads/2023/03/Migration_Report_LT_2023-1.pdf.

© Палітычная сфера




Малюнак 9. Колькасць беларускіх студэнтаў
у Літве, 2013–2025

© Палітычная сфера




Малюнак 10. Грамадзяне Беларусі ў ЕГУ, 2013–2025

# Беларускія студэнты ў Германіі

З 1990-х гадоў Германія застаецца сталым кірункам адукацыйнай міграцыі з Беларусі, аднак у аналізаваны перыяд тут назіралася падзенне, а потым стагнацыя. Паступовае скарачэнне патоку студэнтаў з Беларусі назіралася да палітычнага крызісу 2020 года. У 2013-м колькасць беларускіх студэнтаў складала 1,9 тыс., але к 2019-му знізілася да мінімуму — менш за 1,6 тыс. З 2020 года назіраецца вельмі павольны рост, які хутчэй варта інтэрпрэтаваць як застой, на ўзроўні крыху вышэй за 1,6 тыс.




Малюнак 11. Колькасць беларускіх студэнтаў у Германіі, 2013–2023

# Беларускія студэнты ў Чэхіі

Чэхія з'яўляецца адносна новым кірункам адукацыйнай міграцыі з Беларусі. З 2013-га па 2023 навучальны год колькасць беларускіх студэнтаў у Чэхіі вырасла амаль у два разы, з 577 да 1095 чалавек. Як і ў Польшчы, адным з ключавых фактараў, які спрыяе такому росту, з'яўляецца магчымасць бясплатнага навучання на чэшскай мове.

Аднак, пасля пачатку вайны ва Украіне Чэхія ўвяла абмежаванні для беларускіх студэнтаў, якія тычацца большасці тэхнічных спецыяльнасцяў.[20] У наступныя гады з’явіліся істотныя праблемы з атрыманнем студэнцкіх віз і іншыя абмежаванні. Гэта асабліва важна для інтэрпрэтацыі чэшскага выпадка, а еўрапейская і нацыянальная статыстыкі дэманструюць розныя шляхі працэсу.

У шэрагу Eurostat/OECD студэнты з Беларусі ўлічваюцца паводле краіны паходжання / папярэдняй адукацыі, а не грамадзянства. У такой метадалагічнай логіцы колькасць беларускіх студэнтаў у Чэхіі расла да 2023 года: з 949 чалавек у 2021 годзе да 1043 у 2022-м і 1095 у 2023-м. Аднак у 2024 годзе адбыўся спад — да 923 чалавек.

Нацыянальная чэшская статыстыка, наадварот, дае асобны шэраг менавіта па грамадзянстве студэнтаў. У ім падзенне пасля 2022 года выглядае значна больш рэзкім. Колькасць студэнтаў з беларускім грамадзянствам скарацілася з 1069 чалавек у 2022 годзе да 902 у 2023-м, 750 у 2024-м і 612 у 2025 годзе.[21]

Такім чынам, Чэхія хоць і застаецца адносна важным кірункам адукацыйнай міграцыі з Беларусі, яе далейшыя перспектывы выглядаюць менш устойлівымі на фоне абмежаванняў, уведзеных пасля 2022 года. Гэта пацвярджае і нацыянальная чэшская статыстыка па грамадзянстве, якая паказвае больш выразнае скарачэнне колькасці студэнтаў з беларускім грамадзянствам.

20. Ограничения для абитуриентов и студентов из РФ и Республики Беларусь в университетах Чехии https://www.educationcenter.cz/blog/ogranicheniya-dlya-studentov-iz-rossii-i-belarusi-v-vuzah-chehii/

21. Чэшскае статыстычнае ўпраўленне (ČSÚ). Студэнты і выпускнікі вышэйшых школ у 2001–2025 гадах. https://csu.gov.cz/docs/107508/3890aa10-5dae-63ff-0713-a0acdb6e5a33/23006126.pdf?version=1.0




Малюнак 12. Колькасць беларускіх студэнтаў у Чэхіі, 2013–2024

# Асноўныя высновы

## Агульная колькасць і кардынальныя змены

Агульная колькасць беларускіх студэнтаў за мяжой з 2013 года крыху знізілася: з каля 34 тыс. да 28,8 тыс. у 2023 годзе, з мінімумам у 2017-м (каля 22 тыс.). Але ўлічваючы дэмаграфічныя змены, скарачэнне моладзі і колькасці студэнтаў унутры Беларусі, можна казаць, што значэнне адукацыі за мяжой вырасла. Зараз на аднаго студэнта замежжа прыпадае прыкладна сем студэнтаў у Беларусі, дзесяць гадоў таму (2016) суадносіны былі адзін да трынаццаці.

Акрамя гэтага, адбыліся кардынальныя змены ў геаграфіі беларускага студэнцтва замежжа. Калі ў 2013-м каля 70% такіх студэнтаў навучаліся ў Расіі, то ў 2023-м доля Расіі скарацілася да 32%, і цяпер амаль 70% навучаецца ў Еўропе, галоўным чынам у краінах ЕС. Такім чынам, рост колькасці студэнтаў за мяжой звязаны з павышэннем цікавасці да менавіта еўрапейскага кірунку.

## Найбольш важныя краіны

На гэты момант лідарам у прыцягненні беларускіх студэнтаў выступае Польшча – звыш 44% ад агульнай колькасці, у той час як у 2013 годзе на яе прыпадала толькі 11% беларускіх студэнтаў замежжа. Другое месца займае Расія, і разам гэтыя дзве краіны прыцягваюць каля 76% усіх студэнтаў. Са значным адставаннем ад лідараў ідуць яшчэ тры важныя краіны: Літва, Чэхія, Германія. Доля кожнай знаходзіцца ў дыяпазоне 3–6%, а разам пяць найбольш важных краін прыцягваюць звыш 90% беларускіх студэнтаў.

## Скарачэнне значэння Расіі

Скарачэнне адукацыйнага значэння Расіі можна лічыць першай істотнай тэндэнцыяй дзесяцігоддзя. Яе доля ўпала з 70% да 32%, а ў абсалютных лічбах — з 23 тыс. да каля 10 тыс. Пры гэтым абсалютная большасць беларускіх студэнтаў у Расіі, у адрозненне ад студэнтаў у Еўропе, навучаюцца на завочнай і вочна-завочнай форме.

Дыстанцыйныя студэнты складаюць звыш 70% ад агульнай колькасці. На дзённай форме навучаецца толькі каля 3 тыс. студэнтаў. Падтрымку з федэральнага і іншых бюджэтаў на 2025 год атрымлівалі 1,6 тыс. грамадзян Беларусі, галоўным чынам дзённай формы навучання. Рэшта (85%) праходзіць навучанне на платнай аснове.

# Рост прывабнасці Усходняй Еўропы

Другой найбольш яскравай тэндэнцыяй з'яўляецца рост значэння і прывабнасці Усходняй Еўропы, то бок рэгіянальнае пераразмеркаванне адукацыйнай міграцыі ўнутры еўрапейскай прасторы. Гэта паказвае і фенаменальны рост значэння Польшчы, і вяртанне пазіцый Літвы, а таксама з'яўленне Славакіі як новага важнага кірунку.

Асобна варта адзначыць Чэхію. Нягледзячы на значны рост ў 2013–2023 гадах, калі колькасць студэнтаў з Беларусі павялічылася амаль удвая, пачатак вайны ва Украіне і абмежаванні, уведзеныя чэшскім урадам для беларускіх студэнтаў, вядуць да паслаблення пазіцый Чэхіі.

Рост колькасці беларускіх студэнтаў назіраўся ў шэрагу іншых краін рэгіёну: Эстоніі, Славеніі, Сербіі і іншых. У выніку за апошняе дзесяцігоддзе значэнне Усходняй Еўропы вырасла больш як у два разы — з 24% да 56%, з 6,9 тыс. студэнтаў да 16,1 тыс.

# Стагнацыя і скарачэнне ў Заходняй і Паўночнай Еўропе

У Заходняй і Паўночнай Еўропе можна назіраць адваротную тэндэнцыю. Доля гэтых краін скарачалася ці стагнавала, скарачалася і абсалютная колькасць беларускіх студэнтаў. Доля Заходняй Еўропы скарацілася з 11% да 10%, з 3,2 тыс. да 2,8 тыс. Паўночная Еўропа мела аналагічную тэндэнцыю — скарачэнне колькасці з каля 332 да 260 студэнтаў. У Паўднёвай Еўропе, наадва рот, можна было назіраць паступовы рост, хаця абсалютныя лічбы застаюцца невялікімі. Верагодна, ключавым фактарам большай прывабнасці Усходняй Еўропы з'яўляецца геаграфічная блізкасць, значна ніжэйшы кошт прыжывання і навучання, а таксама больш дынамічны рынак працы, які дазваляе хутчэй і прасцей застацца і інтэгравацца ў краіне.

# Прагнозы

## Дынаміка колькасці

Агульны патэнцыял беларускага студэнцтва замежжа складаў апошнія гады каля 27 тыс. Улічваючы дэмаграфічную і эканамічную сітуацыю ў Беларусі, а таксама змены ў міграцыйнай палітыцы ЕС, гэты паказчык можна лічыць пікавым і, калі не адбудзецца значных новых унутраных і рэгіянальных крызісаў, варта чакаць стабілізацыі гэтай колькасці ці яе паступовага зніжэння.

## Устойлівасць новай геаграфічнай структуры

Геаграфічная трансфармацыя таксама, хутчэй за ўсё, завяршылася, і новая структура размеркавання захаваецца ў каротка- і сярэднетэрміновай перспектыве. Большасць беларускіх студэнтаў замежжа (60–70%) будзе навучацца ў ЕС і іншых еўрапейскіх краінах; доля Расіі будзе вагацца каля адной трэціны, пры гэтым там будуць пераважаць студэнты дыстанцыйных формаў навучання. Прывабнасць Расіі будзе падтрымлівацца рускай мовай і магчымасцю адносна лёгка атрымаць фармальны дыплом. Асноўнымі фактарамі прывабнасці еўрапейскага кірунку будуць больш высокая якасць адукацыі, шырокае міжнароднае прызнанне дыпломаў і перспектывы працаўладкавання і натуралізацыі ў краінах ЕС.

## Магчымыя змены і ўразлівыя кірункі

Дзве ключавыя краіны (Польшча і Расія) будуць прыцягваць да 70% усіх студэнтаў. Разам з Літвой, Чэхіяй і Германіяй яны будуць прыцягваць каля 90%, хаця можна чакаць паступовага пашырэння геаграфіі і павольнага павышэння значэння другасных кірункаў. Асаблівы патэнцыял тут можа мець Турцыя.

Далучэнне новых краін да "вялікай пяцёркі" (больш за 1 тыс. студэнтаў) выглядае малаверагодным. Краіны, якія дэманстравалі імклівы рост колькасці беларускіх студэнтаў (як Славакія), з'яўляюцца невялікімі, і ім будзе цяжка дасягнуць такой высокай прысутнасці беларускіх студэнтаў. У краінах Заходняй Еўропы нельга чакаць прыкметнага росту з прычыны высокага кошту адукацыі і пражывання, вышэйшага парога для паступлення, складаных міграцыйных правілаў і іншых абмежаванняў.

З «вялікай пяцёркі» найбольш уразлівымі для выпадзення выглядаюць Літва і Чэхія. У выпадку Літвы колькасць беларускіх студэнтаў вельмі моцна залежыць ад існавання Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, яго статусу і ўкладанняў

у яго з боку еўрапейскіх інстытутаў. У выпадку Чэхіі галоўнай рызыкай з'яўляюцца абмежаванні, уведзеныя пасля пачатку вайны ва Украіне.

Канец вайны можна ажывіць прывабнасць Украіны як адукацыйнага кірунку, але перспектыва будзе моцна залежаць ад рэгіянальнай бяспекі і стабільнасці.

ІНСТЫТУТ ПАЛІТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА

Інстытут палітычных даследаванняў “Палітычная сфера”
БЕЛАРУСКІЯ СТУДЭНТЫ Ў ЕЎРОПЕ
КОЛЬКАСЦЬ. КРАІНЫ. ДЫНАМІКА
Беларускія студэнты за мяжой:
рост долі і змена выбару паміж Расіяй і ЕС.
Аналіз дынамікі ў 37 краінах — галоўныя тэндэнцыі дзесяцігоддзя
Web: www.palityka.org

Institute of Political Studies "Political Sphere"
BELARUSIAN STUDENTS IN EUROPE
NUMBERS. COUNTRIES. TRENDS
Belarusian Students Abroad: Increasing Share and the Shift
in Choice between Russia and the EU.
Analysis of Dynamics in 37 Countries —
Key Trends of the Decade.
Web: www.palityka.org

Politinių tyrimų institutas „Politinė sfera“
BALTARUSIJOS STUDENTAI EUROPOJE
SKAIČIAI. ŠALYS. TENDENCIJOS
Baltarusijos studentai užsienyje: didėjanti dalis ir pasirinkimo kaita
tarp Rusijos ir ES. 37 šalių dinamikos analizė — pagrindinės
dešimtmečio tendencijos.
Web: www.palityka.org